**Р.Ф.Шаура,**
*прафесар*

# КУЛЬТУРНАЯ ПАЛІТЫКА І МАСТАЦКА-АДУКАЦЫЙНЫ ПРАЦЭС У БЕЛАРУСІ Ў 20-я гг. XX ст.
## (па матэрыялах дзейнасці мастацкай школы ў Віцебску)

У пачатку XX ст., і асабліва ў паслярэвалюцыйны перыяд, культурнае жыццё было неад'емнае ад дзейнасці ўсіх плыняў, накірункаў, формаў і відаў мастацтва. Патрэба ў кадрах мастакоў была надзвычай вялікая ў розных сферах сацыяльнага і культурнага жыцця. Маладая дзяржава Саветаў толькі-толькі станавілася на шлях новага грамадскага развіцця. Прафесія мастака неабходна была ўсюды — у школьных установах, музеях, заводскіх і фабрычных клубах, кніжных выдавецтвах, мастацка-афарміцельскіх і плакатных майстэрнях, тэатрах і інш. Аднак тыя кадры мастацкай інтэлігенцыі, якія заставаліся ў 1920-я гг. у рэспубліцы, не маглі вырашыць важных дзяржаўных задач духоўнага развіцця грамадства. Трэба было рыхтаваць новых спецыялістаў, прыцягваць да мастацкай і культурнай перабудовы таленавітых творцаў з народа, ствараць умовы для іх вучобы і творчай дзейнасці. Нават у першыя гады савецкай улады, калі рэспубліка перажывала гаспадарчую разруху і голад, урадавыя і грамадскія арганізацыі ўдзялялі значную ўвагу мастацкай творчасці. Першыя дэкрэты і пастановы савецкай улады ў галіне мастацтва садзейнічалі развіццю масавай творчасці, спрыялі выяўленню і ўмацаванню яе народнасці. Эканамічныя і гаспадарчыя цяжкасці не маглі спыніць цягі народа да культурнага ўзбагачэння. Усюды ствараліся школы, вячэрнія курсы, рабочыя клубы, студыі самадзейнай творчасці, аматарскія тэатры і хары.

Адукацыя мас, у тым ліку і мастацкая адукацыя, станавілася важнай задачай рабоча-сялянскай улады. А.В.Луначарскі адзначаў, што "мастацкая адукацыя мае два, звязаныя паміж сабой, але тым не менш адметныя адзін ад другога, бакі. Адной яе задачай з'яўляецца шырокае азнаямленне мас з мастацтвам, другой — імкненне выклікаць з іх саміх адзінкі і калектывы, якія зрабіліся б мастацкімі выяўленнямі народнай душы" (1).

Органы дзяржаўнай улады прыкладалі вялікія намаганні ў далучэнні шырокіх мас да мастацкай культуры. На нарадзе Мінскага саюза работнікаў мастацтваў, якая адбылася ў снежні

1920 г., падкрэслівалася важнасць духоўнай культуры працоўных у пабудове новага грамадскага ладу. Перад саюзам была пастаўлена канкрэтная задача: садзейнічаць пачынанням мастацкай творчасці рабочага класа і сялянства.

Самадзейная выяўленчая творчасць народа не з'яўлялася адасобленым звяном у агульнай культуры. Яна атрымала шырокае распаўсюджанне сярод працоўных мас разам з развіццём тэатральных, харавых і танцавальных жанраў. Удзел працоўных у развіцці новай, пралетарскай культуры выяўляўся ў самых разнастайных аспектах мастацкай творчасці: у мастацкім афармленні масавых свят, аздабленні клубаў і чырвоных куткоў, выпуску плакатаў, лістовак, стварэнні жывапісных палотнаў, графічных лістоў, скульптурных кампазіцый.

Мерапрыемствы агітацыйна-масавай прапаганды праводзіліся з удзелам народных майстроў, рамеснікаў, мастакоў-аматараў, што садзейнічала абуджэнню і развіццю творчай самадзейнасці ў рэспубліцы. Народныя майстры, рамеснікі ўдзельнічалі ў ажыццяўленні плана манументальнай прапаганды. Так, у 1919—1920-я гг. у Мінску, Віцебску і іншых гарадах Беларусі ствараліся часовыя помнікі палітычным дзеячам. На жаль, помнікі, а таксама імёны многіх аўтараў не захаваліся, але "... старажылы Мінска ўспамінаюць, што нават адзін з першых часовых помнікаў, установленых у горадзе, — помнік К.Марксу, — быў выкананы мастаком-самавучкам, пекарам па прафесіі" (2).

У 1920-я гг. праводзілася значная работа па наладжванні навучальнага працэсу ў галіне мастацтва. У той час газета "Звязда" на сваіх старонках пісала: "Выяўленчае мастацтва — не раскоша... Яно — неад'емная частка нашай пралетарскай культуры... Пачынаючы з ніжэйшых школ, выяўленчае мастацтва павінна быць абавязковым, правільна і сур'ёзна пастаўленым прадметам побач з іншымі выкладчыцкімі дысцыплінамі" (3).

Дырэктыўнымі органамі прадугледжвалася пашырэнне школ, устаноў, гурткоў мастацкай самадзейнасці, вячэрніх курсаў, студый выяўленчага, музычнага і драматычнага мастацтваў. У 1919 г. Віцебскі пададдзел мастацтва губвыканкама прыняў рашэнне аб стварэнні мастацкага вучылішча, камунальнай майстэрні, дзвюх школ у Веліжы і Невелі, а ва ўсіх павятовых гарадах — мастацкіх школ-студый. Акрамя таго, намячалася стварэнне спецыяльнай школы мастацкай адукацыі для падрыхтоўкі школьных работнікаў па выяўленчым мастацтве

з функцыяніруючымі пры школе кароткатэрміновымі курсамі інкрустацыі.

У далучэнні працоўных да мастацтва пэўную ролю адыграла Віцебская народная мастацкая школа. Стварэнне яе адносіцца да 1918 г., калі, як сведчаць архіўныя дакументы, народны камісар асветы А.В.Луначарскі падпісаў дырэктыву аб прызначэнні Марка Шагала ўпаўнаважаным па справах мастацтва і мастацкай прамысловасці Віцебскай губерні, у абавязкі якога ўваходзілі арганізацыя мастацкіх школ, выстаў, стварэнне музеяў, мастацкіх прадпрыемстваў і інш.

У 20-я гг. Маркам Шагалам была праведзена значная работа па аб'яднанні мастацкіх сіл горада, а таксама святочным афармленні Віцебска з нагоды 1-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі і адкрыцці мастацкай школы. Афіцыйнае адкрыццё школы адбылося 28 студзеня 1919 г. У прэсе была змешчана праграма мастацкай школы, галоўнай задачай якой называлася ўкараненне ў жыццё новага, рэвалюцыйнага мастацтва з яго філасофскай і эстэтычнай канцэпцыямі развіцця. У структуру народнай мастацкай школы павінны былі ўвайсці класы прыкладнога мастацтва з майстэрнямі разнастайных дэкаратыўных профіляў — роспісу, лепкі, мастацкай апрацоўкі дрэва, плаката, афармлення шыльдаў і інш. Пры паступленні ў народную мастацкую школу перавага аддавалася выхадцам з рабочых і сялян, спецыяльнай адукацыі для гэтага не патрабавалася.

У гэты час Віцебск становіцца прыметным цэнтрам культурнага жыцця. Са шматлікіх куткоў Расіі збіраюцца тут моцныя мастацкія сілы сцвярджальнікаў "новага мастацтва": К.Малевіч, М.Дабужынскі, В.Ермалаева, Л.Лісіцкі, М.Коган, М.Суэцін і інш. М.Дабужынскі становіцца дырэктарам мастацкай школы. Ён фарміруе выкладчыцкія кадры, праводзіць адукацыйную палітыку ў кантэксце УНОВІСа (ад "утвердители нового искусства"). Значны ўплыў на футурыстычна-супрэматычны ўхіл у развіцці мастацтва аказалі К.Малевіч, В.Лісіцкі, В.Ермалаева, І.Чашнік, М.Суэцін, якія стварылі мастацкае аб'яднанне (УНОВІС). У 1921 г. быў заснаваны часопіс пададдзела мастацтва Віцебскага губвыканкама і Саюза работнікаў мастацтва Віцебска "Мастацтва", на старонках якога выступалі К.Малевіч, М.Кунін, крытыкі А.Ром, П.Мядзведзеў і інш.

На працягу 1920—1921 гг. Віцебская народная мастацкая

школа (у шматлікіх архіўных дакументах кваліфікуецца як Народнае мастацкае вучылішча) пераўтвараецца ў дзяржаўныя мастацкія тэхнічныя майстэрні і ў хуткім часе набывае статус вышэйшай мастацкай школы — Мастацка-практычнага інстытута. Рэктарам яго прызначаецца В.Ермалаева. З першых дзён функцыянавання Мастацка-практычнага інстытута сутыкнуліся дзве супрацьлеглыя мастацкія плыні — рэалістычна-акадэмічная на чале з Ю.Пэнам і плынь “левых”, кіраўнікамі вучэбна-творчых майстэрань якіх былі М.Шагал, К.Малевіч, Л.Лісіцкі, В.Ермалаева, М.Коган. Акрамя таго, вучэбна-творчыя і арганізацыйныя пытанні тут знаходзіліся на неналежным узроўні. З даклада загадчыка Віцебскага губернскага камітэта мы даведваемся, што дакументацыя не вялася правільна ў ВНУ. Навучэнцы пераходзілі з адной у другую вучэбную майстэрню, не засвоіўшы пэўных ведаў і навыкаў. Не было і спецыяльных уступных экзаменаў для абітурыентаў. За час існавання мастацкай установы з эксперыментальнай трансфармацыяй з адной формы ў другую ў ёй навучалася 610 навучэнцаў, але было выпушчана толькі 11 чалавек і пераведзена ў петраградскія і маскоўскія майстэрні 17 чалавек (4). Сярод навучэнцаў З.У.Азгур, Н.І.Туржанскі, І.М.Зельдзін, В.К.Зейлерт, І.Б.Фрадкін, Н.У.Іванова і іншыя, хто ўнёс значны ўклад у прафесійнае выяўленчае мастацтва і наогул мастацкую культуру нашай дзяржавы (5).

З архіўных крыніц па матэрыялах функцыянавання Віцебскай мастацкай школы на працягу 1918—1923 гг. пэўную цікавасць для мастацтвазнаўства ўяўляе яе педагагічны склад. Так, у 1918 г. пасаду дырэктара Віцебскай народнай мастацкай школы займаў Мсціслаў Валяр’янавіч Дабужынскі (1875—1957), вядомы жывапісец, графік, спецыяліст тэатральна-дэкаратыўнага мастацтва. У пачатку 20-х гг. ён эмігрыраваў за рубеж і ўвесь астатні час жыў і працаваў там. У перыяд 1920—1922 гг. загадчыкам Віцебскай народнай мастацкай школы працавала Вера Міхайлаўна Ермалаева (1895—1958), жывапісец і графік. Лазар Маркавіч Лісіцкі (1890—1941) першапачатковую мастацкую адукацыю атрымаў у Віцебскай школе малявання і жывапісу ў Ю.М.Пэна, а пасля стварэння Мастацка-практычнага інстытута працаваў выкладчыкам у гэтай установе.

Як ужо ўпаміналася, заснавальнік групы УНОВІС і аўтар сусветна вядомай карціны “Чорны квадрат” Казімір Севярынавіч Малевіч (1878—1937), жывапісец, графік, спецыяліст у галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, з 1919 г. узначальваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучэбна-творчую маайстэрню ў Віцебскай мастацкай школе, а потым у Мастацка-практычным інстытуце. У ліку выкладчыцкага складу мастацкай установы да 1921 г. знаходзіўся Іван Альбертавіч Пуні (1894—1956), выдатны жывапісец, актыўны дзеяч у сферы культуры.

Шмат намаганняў у арганізацыі культурнага жыцця ў Віцебску і Віцебскай губерні ў першыя паслярэвалюцыйныя гады прыклаў Марк Захаравіч Шагал (1887—1985), ураджэнец Віцебска, жывапісец і графік. Марк Шагал навучаўся ў прыватнай школе малюнка і жывапісу ў Ю.М.Пэна. Значую работу ён праводзіў па стварэнні мастацкіх школ і студый у губерні, па арганізацыі творчых выстаў, мастацкім афармленні горада, калі знаходзіўся на пасадзе ўпаўнаважанага па справах мастацтва Віцебскага губвыканкама. Да свята першай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі горад упрыгожвалі яго маляўнічыя плакаты “Уперад, уперад, без перапынку”, “Коннік з трубой”, “Мір хацінам, вайна палацам” і інш.

Віцебская мастацкая школа (пазней мастацкія майстэрні і Мастацка-практычны інстытут) размяшчалася ў былым доме-шпіталі Вішняка (зараз будынак № 9 па вул. газеты “Праўда”). Менавіта ў першай палове 20-х гг. у Віцебску адзначалася надзвычай бурлівае, імклівае і супярэчлівае мастацкае і культурнае жыццё, якое нараджалася і прарастала на грэбені магутных сацыяльна-культурных, эканамічных, палітычных і грамадска-маральных пераўтварэнняў глабальнага маштабу. Парасткі новай канцэпцыі мастацтва, канцэпцыі супрэматызму, кубізму, футурызму, рэалізаваныя плеядай мастакоў-наватараў Віцебска ў 20-я гг., былі падхоплены культурным асяроддзем Заходняй Еўропы і атрымалі там урадлівую глебу для далейшага развіцця.

Культурнае жыццё Віцебска 20-х гг., творчасць вядомых жывапісцаў, графікаў, майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, прызнаных сусветнай мастацкай грамадскасцю, — гэта асобная з’ява агульнай мастацкай культуры. Сусветную славу мастакоў-наватараў, прадстаўнікоў неардынарнага філасофска-вобразнага мыслення, заваявалі Марк Шагал, Казімір Малевіч, Васіль Кандзінскі, Лазар Лісіцкі і інш. На вялікі шлях творчай і педагагічнай дзейнасці выйшлі выхаванцы Віцебскай мастацкай школы У.Чашнік, А.Ахола-Вало, З.Азгур, В.Зейлерт, І.Зельдзін і інш. Віталь Канстанцінавіч Зейлерт, напрыклад, у даваенны перыяд не толькі творча працаваў на ніве жывапісу і графікі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

але і выконваў вялікую работу па збору і камплектацыі музейных экспанатаў, твораў мастацтва для мастацкай галерэі. У пасляваенны час ён выкладаў мастацтва ў Віцебскім мастацкім вучылішчы, а потым — на мастацка-графічным факультэце Віцебскага педагагічнага інстытута.

З 1923 г. Мастацка-практычны інстытут спыняе навучальную дзейнасць і пераўтвараецца ў Віцебскі мастацкі тэхнікум. На выкладчыцкую дзейнасць запрашаюцца мастакі акадэмічнага накірунку І.Ахрэмчык, Л.Лейтман, М.Каспяровіч, В.Волкаў, М.Керзін, М.Эндэ, У.Хрусталёў, Ф.Фогт, Г.Шульц і іншыя, якія стварылі выдатную школу падрыхтоўкі нацыянальных кадраў у галіне выяўленчага мастацтва.

У тэхнікуме на высокім прафесійным узроўні выкладаліся такія дысцыпліны, як жывапіс, малюнак, скульптура, пластычная анатомія, перспектыва, гісторыя мастацтва і іншыя, працавалі керамічныя, графічныя і дэкарацыйныя майстэрні. З 1926 г. функцыянавалі аддзяленні малярства, разьбярства, мастацка-педагагічны, а пазней — графічны аддзелы. Студэнты тэхнікума прымалі актыўны ўдзел у творчых выставах разам з прафесіяналамі ў мастацкім афармленні Віцебска да свят. Мастацкі тэхнікум як кузня нацыянальных мастацкіх кадраў выхаваў шматлікую плеяду жывапісцаў, графікаў, скульптараў, такіх як В.Цвірка, З.Азгур. П.Масленікаў, Я.Зайцаў, С.Селіханаў, П.Гаўрыленка, Я.Ціхановіч, М.Беляніцкі, А.Кроль і інш. У далейшым яны сфарміравалі выдатную нацыянальную школу рэалістычнага выяўленчага мастацтва, якая выхавала і выхоўвае зараз новыя пакаленні таленавітых творцаў.


1. *Луначарский А.В.* Об изобразительном искусстве. — М., 1967. — Т. 2. — С. 373.

2. *Орлова М.* Искусство Советской Белоруссии. — М., 1980. — С. 54.

3. *Звязда.* — 1921. — 2 крас.

4. *Дзяржаўны* архіў Віцебскай вобл., ф. 246, воп. 1, спр. 310, л. 95.

5. *Там жа*, ф. 837, воп. 1, аддз. 1, л. 28.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ